# Калекцыя унікальных кніг

Няма такога дня, каб пошта не даставляла ў Беларускую дзяржаўную бібліятэку імя У. І. Леніна кніжных павінак. Фонды яе няспынна растуць. У гэтай бібліятэцы можна атрымаць любую кнігу, якая выйшла ў Беларусі за гады Савецкай улады. Ёсць на яе паліцах і літаратура з выдавецкімі грыфамі Масквы, Ленінграда, Кіева і шмат якіх іншых гарадоў нашай краіны.

Вельмі шмат часу патрэбна для таго, каб хоць бегла, хоць па каталогах азнаёміцца са скарбамі, якія захоўваюцца ў нашай бібліятэцы. Але асаблівую цікавасць выклікаюць рэдкія кнігі, якія доўга і карпатліва збіралі навуковыя работнікі бібліятэкі.

Рэдкая кніга—гэта помнік культуры, крыніца ведаў і разнастайных фактаў, гэта сведка незабыўных падзей. Немагчыма без хвалявання перагортваць загады героя Айчыннай вайны 1812 года М. І. Кутузава, выдадзеныя больш як 150 гадоў назад непасрэдна ў палявых умовах.

А вось маленькія кніжкі з віньеткамі і іншымі паліграфічнымі ўпрыгожаннямі. Гэта творы А. С. Пушкіна. Яны выдадзены ў Пецярбургу ў той далёкі час, калі аўтар «Яўгенія Анегіна» яшчэ жыў, пісаў, ахоплены новымі творчымі планамі. Ёсць тут і выданні іншых пісьменнікаў, якія выйшлі пры іх жыцці, у тым ліку і Мікалая Някрасава.

Бязлітасная і жорсткая была цэнзура царскага самадзяржаўя. Колькі цудоўных кніг было знішчана ў той змрочны час! Але іншы раз удавалася выратаваць лічаныя экземпляры забароненых кніг. І цяпер з некаторымі з іх можна азнаёміцца ў бібліятэцы імя Леніна. Ёсць тут і кнігі, якія выходзілі без цэнзуры за межамі Расіі: у Жэневе, Лондане і іншых гарадах свету.

У аддзеле рэдкай кнігі захоўваюцца творы Уладзіміра Ільіча Леніна, якія выдадзены бальшавіцкай партыяй ва ўмовах эміграцыі. А ці ж можна не зацікавіцца пратаколамі другога з'езда РСДРП, якія выдадзены ў хуткім часе пасля сканчэння яго работы. Вялікім скарбам з'яўляюцца таксама кнігі Фрыдрыха Энгельса, якія ён падарыў рускаму рэвалюцыянеру П. Лаўрову.

Немагчыма расказаць аб усёй калекцыі унікальных кніг, аб гэтым цудоўным скарбе, якім шчыра можна ганарыцца. Для цікаўных шырока расчынены дзверы нашай Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі.

С. САДОЎСКАЯ.

